губерні, наша становішча было вельмі цяжкім, але мы ніколі не падалі духам. Там я пазнаёміўся са старымі бальшавікамі — М. М. Загуменнай, А. А. Чарапанавым, А. А. Садзінай-Чарнявінай і іншымі. Памятаю, як святкавалі 1 Мая 1910 г. З навакольных вёсак сабралася чалавек шэсцьдзесят паліткатаржан. На нагах яшчэ не зніклі сляды ад кайданоў, многія не змянілі арыштанцкіх бушлатаў. З чырвонымі сцягамі і рэвалюцыйнымі песнямі мы ішлі па вёсцы. Мясцовыя сяляне яшчэ не бачылі такога шэсця, арганізаванасці, не чулі нашых песень. Яны гаварылі: «Гэта харугва паліткатаржан». Дэманстрацыя зрабіла на ўсіх такое вялікае ўражанне, што жандары разгубіліся і не ведалі, што рабіць.

У 1912 г. я і ўральскі рабочы Рыгор Котаў рашылі ўцячы з ссылкі. Прабіраліся праз усю Расію — у Парыж, да Леніна. Ніколі не забуду сустрэч з Уладзімірам Ільічом і Надзеяй Крупскай. Я неаднаразова прысутнічаў на сходах парыжскай секцыі сацыял-дэмакратаў, на якіх абмяркоўваліся ўнутрыпартыйныя і міжнародныя пытанні.

Мая спецыяльнасць друкара вельмі спатрэбілася ў Парыжы. Я працаваў у друкарні, у якой выдаваўся цэнтральны орган партыі «Сацыял-дэмакрат». Ішоў час, у Расіі спела рэвалюцыя...

У верасні 1917 г. я вярнуўся з эміграцыі ў Расію. Хутка па мандаце Цэнтральнага камітэта партыі за подпісам Уладзімірскага і Нагіна быў накіраваны ў Крым для падпольнай работы і барацьбы за Савецкую ўладу.

...Лёс складваўся так, што на працягу амаль 60 гадоў мне не ўдавалася пабываць у Мазыры. І вось я ў горадзе майго юнацтва... Вельмі многіх баявых таварышаў ужо няма. Яны жылі, змагаліся, спадзяваліся. Цяжка сказаць, ці спраўдзіліся сёння іх спадзяванні... Добра хоць тое, што засталася пра іх памяць.

### З РАПАРТА МАЗЫРСКАГА ПАВЯТОВАГА СПРАЎНІКА МІНСКАМУ ГУБЕРНАТАРУ

*29 ліпеня 1914 г.*

«...Инициаторами крестьянских выступлений являлись запасные, участвовавшие в русско-японской войне. Если в апреле и мае 1914 года произошло по одному выступлению крестьян в Мозырском уезде, то в июле их было уже 20. Многие участники этих выступлений были арестованы и 60 человек осуждены военно-полевым судом...»

*Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (РДГА). Ф. 295. Воп. 1. Спр. 802.*

### ПАВЕДАМЛЕННЕ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ

*24 студзеня 1915 г.*

18 ноября 1914 г. Минским Военно-Окружным Судом присуждены к смертной казни через повешение крестьяне Николай и Ярослав Коханевичи, Патрикий и Ефим Скаковцы, Александр и Григорий Охремчуки, Семен и Дмитрий Колодичи, Тимофей, Михаил и Иван Кулакевичи, Федор Кибукевич и Иван Кравченя, обвиняемые в разбойном нападении на имение Великий Боков Мозырского уезда, помещицы Бржезовской.

Приговор этот утвержден генерал-адъютантом Ивановым лишь в отношении Николая Коханевича, Патрикия Скаковца и Александра Охремчука, а в отношении остальных осужденных смертная казнь заменена каторжными работами: Дмитрию и Семену Колодичам, Ивану Кравчене, Ярославу Коханевичу, Тимофею и Михаилу Кулакевичам, Федору Кибукевичу и Ивану Кулакевичу без срока каждому, а Ефиму Скаковцу и Григорию Охремчуку на двадцать лет каждому.

Приведение приговора над осужденными к смертной казни через повешение состоялось в ночь на 18 декабря 1914 г.

Губернатор, камергер Высочайшего Двора
Правитель канцелярии

*Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НА РБ). Ф. 295. Воп. 1. Спр. 8703. Л. 178.*

## Слаўныя імёны

**Васільева Анастасія Якаўлеўна** — беларускі этнограф, фалькларыст і краязнавец 2-й паловы XIX ст. Настаўнічала ў Пінску, Мазыры і іншых месцах беларускага Палесся, некаторы час працавала валасным пісарам у в. Грабаў (цяпер Петрыкаўскі р-н). Актыўна даследавала побыт, матэры-

яльную культуру, абрады, фальклор сялян, рабіла гісторыка-этнаграфічнае апісанне вёсак Мазыршчыны. Артыкулы «Нататка пра побыт сялян Мазырскага павета», «Веснавыя песні і абрады ў вёсках Мазырскага павета», «Кірмашы ў Мазырскім павеце», «Вытрымкі з жыцця беларускай жанчыны» і многія іншыя былі надрукаваны ў 1877—1881 гг. у газетах «Минские губернские ведомости» і «Виленский вестник».

## ЗАМЕТКИ О БЫТЕ КРЕСТЬЯН МОЗЫРСКОГО УЕЗДА В 70-Х ГОДАХ XIX ст.

### Пища

...Самый употребительнейший хлеб — ржаной (озимой и яровой ржи), который пекут большими круглыми караваями, на засушенных кленовых листьях. Иногда за недостатком ржаной муки в хлеб подмешивают гречневую. И очень редко, в самые неурожайные годы, рожь мелют невеяную, отчего хлеб выходит пополам с мякиною, по местному выражению — «пушный», впрочем, хлеб этот редко употребляется. На крестины, пасху и другие праздники пекут пироги из той же муки, только поменьше и продолговатой формы, которые сверху обсыпаются мукой, а на свадьбу эти пироги украшают узорами, делаемые резцом в виде кружочков, колец, звездочек и прочее; иногда на свадебные пироги накладываются особые украшения «шишки» в виде колец, еловых шишек, петухов, голубей и др.; в деревнях, лежащих близ местечек, на свадьбу пекут пироги такой же формы из пшеничной муки.

Весною собирают березовый сок, в который кладут ячмень, дубовые листья, кору, и когда он, постояв некоторое время, закисает, его употребляют для варки щей и питья; других квасов почти не приготовляют, предпочитая описанный лучше других.

### Одежда

Мужчины всех возрастов, даже небольшие мальчики, носят одинаковую одежду, именно: летом шаровары из толстого холста, довольно широкие, поверх шароваров надевается такого же холста рубаха, с прямым воротом, оставляя притом грудь открытою; на шею надевается «хустка» — кусок холста в 1 аршин длины и $^1/_4$ аршина ширины, на концах крайная кайма, которая ткется вместе с жилетом, поверх рубахи одевается «камзелька», род жилета из домашней крашеницы, стан обматывается длинным красным или пестрым поясом, к которому привешивается на узком ремне калита, кресало и нож, т. е. маленькая в 1 вершок в квадрате кожаная сумка с крышкою, застегивающая на большую медную пуговицу, огниво, которое употребляется при плетении лаптей, в калите же хранятся все курительные принадлежности.

Зимою вся эта одежда делается из сукна собственного приготовления — серого или черного, а сверху всего этого одевается свита и кожух, шитые наподобие казакина, у более щеголеватых свиты и кожухи по всем швам, на груди, рукавах и снизу обкладываются в несколько рядов красными и синими шерстяными шнурками. Если прибавить ко всему этому шапку «магерка» из серого сукна, квадратную, обшитую шнурками, с откидным околышем, который у зимних шапок делается из овчины и опускается на уши в виде крышек, то получится полный костюм, который полешук не изменит, несмотря даже на особенную зажиточность, только разве вместо лычных лаптей надевает смазанные дегтем сапоги.

Женщины одеваются гораздо щеголеватее мужчин. В деревнях Грабовской и других волостей носят «андараки» — это зимняя суконная юбка, тканая в черные, красные и желтые клетьи, такой же передник и корсет без рукавов, рубахи на плечах ткут красными нитками, на шее носят «пацирки», т. е. стеклянные бусы всех цветов, множество крестиков и разных медных вещиц, на голове «наметка» — длинная белая холстина в 3 аршина длины и $^1/_2$ аршина ширины, а на концах красная кайма, она наматывается на лубок «лямец» и надевается в виде шапки, сзади остается длинный конец, который, проходя под корсетом, висит ниже пояса, спереди волосы видны. Сверху, как мужчины, надевают свиты и кожухи, одинакового покроя, только с большим количеством шнурков, на пальцах множество медных перстней. Летом андараки заменяются белыми или пестрыми юбками и передниками с красными снизу каймами. Девичий наряд ничем не отличается от женского, только на голове вместо наметки красный платок, обвязанный кругом головы, волос наружу не показывают...

**Музыка и поэзия**

Некоторые крестьяне играют на скрипках своего изделия, учатся играть один от другого, и выдающихся способностей к игре ни у кого не замечается. Почти все мужчины и женщины поют, некоторые отличаются недурным голосом, но зато поют механически, без малейшего оттенка, чувства и пересказать словами пропетого не могут. Песня их грустного напева и содержания: во всех выражается жалобы на недостаток хлеба, на дурное обращение свекра, свекрови и других родных, слышатся стоны, вырываемые болью от побоев мужа-пьяницы, недбалицы и непосильного тяжелого труда, но кто сложил эти песни, никто не знает, но, вероятно, они сложились сами собою в давнее трудное время, когда крестьянин изнывал под гнетом крепостного права.

Кроме этих песен есть много и других, которые распределяются по временам года и занятиям, как-то: весенние, жнивные, толочанские, святочные, пасхальные, свадебные и другие, но хотя которая начинается весело, под конец все-таки упоминается одна из нужд народа, иногда переход от веселого к грустному так быстро, что думается, что это другая песня, а между тем по размеру слов и напеву убеждаешься в противном.

В описываемой мною местности нигде не упоминается о богатырях; только в селе Грабово крестьяне рассказывали мне, что в очень давние времена у них был хлопец — пастух, который убил когда-то чужестранного богатыря в рукопашной схватке, поссорившись с ним за кусок сала. Чужестранец тот удивлял всех своею силой и не мог жить без драки, причем ревел, как бык. Могилы пастуха-богатыря никто не знает, так как после одержанной им победы над таким сильным противником его увезли куда-то далеко показывать людям как чудо.

*«Минские губернские ведомости».* 1879. №17, 18.

**Сержпутоўскі Аляксандр Казіміравіч** — беларускі этнограф і фальклараст. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю і Пецярбургскі археалагічны інстытут. У 1884—1893 гг. настаўнічаў на Мазыршчыне і Случчыне. Да 1930 г. працаваў у этнаграфічным аддзеле Рускага музея ў Ленінградзе. Сабраў на Беларусі багаты этнаграфічны і фальклорны матэрыял. У этнаграфічным нарысе «Беларусы-палешукі» (1908) апісаў пабудовы, побыт, звычаі і вераванні сялян Мазыршчыны. Выдаў зборнікі «Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў» (1911), «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» і інш. У Мазырскім павеце ў канцы 90-х гадоў запісаў тэксты 53 беларускіх народных песень.

Памёр у 1940 г.

Вось адна з казак, запісаных А. К. Сержпутоўскім на Мазыршчыне.

## ШАПТУХА

У якомсь сяльцы жыла старэнькая баба. Была яна адна, бы тая былінка ў полі. Усе яе крэўныя да сваякі даўно паўміралі, а яна як асталася, так і ліпіць, як тое гнілое да старое дзерава. Сяльцо было маленькае, мо якіх дамоў дзесяць. На самым канцы стаяла бабіна хатка. Яна была такая старэнькая, як і сама баба... Знайшоўся якісь добры чалавек, што нарабіў у бабінай хатцы падпорак да аблажыў яе загатай: от і стаіць старэнькая, абросшая мохам, бы яе хазяйка, хатка...

Назбірае баба шчэпачак, падтопіць у печцы да й апякаецца перад полымем. Ведама, на старасці дак і ўлетку холадна. Вот так і жыве сабе старэнькая баба: калі ёсць што, то з'есць, а калі няма, дак і так абойдзецца. Да й колькі ёй трэба? Дасць хто кольвек асушкаў хлеба або бульбы, от баба размочыць скарынку да й пасмокча яе трохі бяззубым ротам, а бульбу спячэ ў прыску да й есць. От гэтым і жывілася тая баба ўжо пэўне гадоў з сарачню. Бачыце, ёй ужо было мо больш як гадоў сто.

Мо яшчэ доўга б пражыла так тая баба, але от раз ехаў праз тое сяльцо тамашны пан, убачыў ён старэнькую бабу і здзівіўся, што яна так доўга жыве.

— Хіба ж ты, бабка, яшчэ жыва? — пытае пан.

— Жыва, паночку... От не дае Бог смерці...

— Як жа ты жывеш?

— Якое маё жыццё, паночак! Як так жыць, дак лепей гніць: зарабіць — не ўздо-

лею, а дзеткі і ўнукі ўсе даўно паўміралі. Некаму і вады падаць.

— Чаму ж ты, баба, не шэпчаш або не варожыш?

— Не ўмею...

— Слухай, баба, я цябе наўчу.

— Наўчы, паночак, наўчы, каб і я недарма свет займала.

Пан прыхіліўся к вуху ды й кажа бабе:

— От як пазавуць цябе к хвораму, дык ты пахукай трэйко на яго ды й шапчы: «Сіголаў жыў, сіголаў не». Пашапчы о гэ трохі, дай яму выпіць вады, ён і паправіцца. А калі памрэ, сіголаў яго бяры. От за тое цябе будуць карміць і паважаць.

Падзякавала баба пану, ды й пачала шаптаць...

Пайшла чутка, што аб'явілася такая баба, такая шаптуха, што вельмі добра шэпча... Павалілі к той бабе адусюль, нясуць і вязуць усякага дабра. Жыве сабе баба ані гаткі. Тым часам той пан, што наўчыў бабу шаптаць, чуе аб тым ды толькі смяецца сабе ціхенька з дурных людзей.

Але вось пайшоў той пан на паляванне, спацеў да пакрычаў проці ветру, от і зрабілася ў яго ў горле скула. Пан к дахтурам — куды там — от-от скула задавіць. Жонка кажа, каб пазвалі тую бабу, а пан і слухаць не хоча, але, нарэшце, як прыпёрла ліха, так згадзіўся. Прыйшла баба, а пан ужо чуць дыхае. От давай баба хукаць да шаптаць: «Сіголаў жыў, сіголаў не».

Прыслухаўся пан, ды як учуў, што баба шэпча тое, што ён яе вучыў, дак яго апанаваў такі смех, што не можа вытрымаць. А баба шэпча і шэпча. Слухаў-слухаў пан ды як зарагоча — скула і трэснула. Выздаравеў ён да й пытае ў бабы:

— Ці ж ты, бабка, усё так лечыш?

— Эге ж, мой саколіку, усё так...

Дык вось як шаптала ды варажыла тая баба.

## Даследчык народаў Поўначы

Дзіцячыя і юнацкія гады Эдуарда Пякарскага прайшлі ў Мазыры і ў Барбарове, дзе жыў яго дзед Рамуальд Пякарскі, упраўляючы маёнтка памешчыка Горвата. Эдуард вучыўся ў Мазырскай гімназіі. У 1873 г. яе рэарганізавалі ў прагімназію, замест васьмі класаў стала шэсць. Каб атрымаць сярэднюю адукацыю, Эдуард вымушаны быў пакінуць Мазыр. Вучыўся ў Мінскай, Таганрогскай, Чарнігаўскай гімназіях, дзе пазнаёміўся з рэвалюцыйнай літаратурай. Ён распаўсюджваў творы Чарнышэўскага, Пісарава, народніцкую газету «Вперед».

Затым Э. Пякарскі вучыўся ў Харкаўскім ветэрынарным інстытуце, хутка ўвайшоў у атмасферу грамадскіх інтарэсаў, якімі жыла перадавая моладзь. Ён стаў удзельнікам студэнцкіх сходак, дзе абмяркоўваліся шляхі звяржэння царскага самаўладства, узначальваў дэманстрацыі пратэсту супраць самадзяржаўя. Далейшы лёс юнака склаўся так, што ён быў вымушаны пакінуць вучобу і перайсці на нелегальнае становішча...

А потым — астрогі, этапы, высылкі... Э. Пякарскі сябраваў з такімі вядомымі людзьмі, як пісьменнік У. Караленка, прафесійны рэвалюцыянер П. Аляксееў. Калі Аляксеева забілі, Пякарскі дапамог раскрыць злачынства. У Якуціі, куды Э. Пякарскі быў высланы ў канцы XIX ст. на 25 гадоў, ён самастойна вывучыў якуцкую мову, запісваў лексіку, песні, прыказкі, прымаўкі і іншыя фальклорныя творы гэтага самабытнага народа.

Тут, у Якуціі, Э. Пякарскі здзейсніў сапраўдны навуковы подзвіг, стварыўшы ў надзвычай складаных умовах першы ў гісторыі слоўнік якуцкай мовы з апісаннем побыту, вераванняў, культуры гэтага паўночнага народа, напісаў шэраг фундаментальных прац пра духоўную і матэрыяльную культуру народаў Поўначы. За гэтыя працы даследчык быў узнагароджаны залатымі медалямі Расійскай акадэміі навук і Рускага геаграфічнага таварыства, імя яго набыло сусветную вядомасць.

Працамі Пякарскага зацікавіліся вядомыя цюркологі краіны, з ім у ссылцы трымалі перапіску вучоныя Пецярбурга, Парыжа, Варшавы, Стамбула. У пачатку XX ст. улады дlaunched даручылі Э. Пякарскаму ўзначаліць экспедыцыю па даследаванні духоўнай культу-

ры і мовы эвенкаў. Адзін з заснавальнікаў якуцкай літаратуры А. Е. Кулакоўскі пісаў Э. К. Пякарскаму: «У нас не было літаратуры, ваш слоўнік павінен паслужыць падмуркам для яе стварэння. Вы сапраўды заслугоўваеце імя «бацькі якуцкай літаратуры». Без вас не знайшлося б асобы, у якой хапіла б дзёрзкасці прыняць на сябе такую каласальную працу, як ваш слоўнік...»

У 1906 г. па хадайніцтве Расійскай акадэміі навук Э. К. Пякарскі пераехаў у Пецярбург. За 45 гадоў навуковай дзейнасці ён стварыў цэлую энцыклапедыю жыцця народаў Поўначы. Сабраны і адпрацаваны матэрыял уяўляе сабою, як пісаў усходазнаўца В. Радлаў, «карціну разумовага жыцця народа, закінутага лёсам на далёкую поўнач Азіі».

Э. К. Пякарскі быў ганаровым членам Акадэміі навук СССР.

Памёр Э. К. Пякарскі 29 чэрвеня 1934 г. Некралог змясцілі ўсе цэнтральныя газеты Савецкага Саюза, навуковыя часопісы Венгрыі, Польшчы. Урад Якуціі ўшанаваў памяць вучонага ўстанаўленнем дзвюх стыпендый яго імя.

*В. Шур*

## Як вучылі на Мазыршчыне

Першая навучальная ўстанова ў Мазыры, створаная езуітамі, адносіцца да пачатку XVIII ст. Мазыршчына ўваходзіла ў склад Рэчы Паспалітай, і не дзіўна, што выкладанне вялося на польскай мове. З цягам часу руская мова выцясняла польскую. У 1803 г. павятовая школа пераўтвараецца ў павятовае вучылішча. Такім чынам, адзінай навучальнай установай у Мазыры ў пачатку XIX ст. было дваранскае двухкласнае вучылішча, якое знаходзілася ў веданні Варшаўскай адукацыйнай камісіі. Пасля закрыцця яе ў 1804 г. вучылішча перайшло ў падпарадкаванне Віленскага універсітэта. Вучыцца мелі права дзеці дваран і заможнай часткі насельніцтва. У вучылішчы выкладаліся закон Божы, расійская і польская мовы, арыфметыка (з трэцяга класа геаметрыя), гісторыя, чыстапісанне, чарчэнне, маляванне. Ва ўсіх класах было дваццаць урокаў у тыдзень, урок працягваўся 90 хвілін.

У сувязі з прадпісаннем Праўлення Віленскага універсітэта ад 30 чэрвеня 1830 г. за № 3317 у Мазырскім вучылішчы было ўстаноўлена 5 класаў і дабаўлены некаторыя прадметы — французская, нямецкая мовы, фізіка. Выкладанне вялося на польскай і рускай мовах. Наглядчык вучылішча Ф. Апасінскі гаварыў:

> «Сие новое попечение училищного правления имело и то в виду... Дабы помещикам и прочим в значительном достатке живущим сходно было и с меньшими издержками учить детей своих так, чтобы из таковых училищ прямо поступали в университет... Мнение учителей о нравственности и религии хорошее, прилежание и успехи в науках не худые. Никаких значительных преступлений между учениками не было и чрезвычайные наказания не были употребляемы. Ученики в науках и нравственности превосходные, по причине прекращения курса наук не были избираемы. Здоровье учеников было повременно прерываемо болезнью, особенно лихорадкою, горячкою и пр., почему ученики имели препятствия в науках. Два ученика умерли.
>
> Училищные здания большей частью по 1 сентября 1830 г. починены, один дом вновь построен. Дом смотрителя еще не починен... Трем учителям квартиры нанимаются, но по совершенном окончании починок домов для двух только учителей нужны будут только квартиры, кроме законоучителя грекороссийского исповедания, который и теперь квартиры не имеет. Пожертвований никаких училище не имело.
>
> Эпидемическая болезнь холера была поводом о прекращении курса наук сего года, и, по причине распространения оной в г. Мозыре, ученики с 10 апреля 1831 г. распущены по домам, где находились по 1 сентября».

У 1830—1831 гг. у вучылішчы працавала 8 настаўнікаў, займалася 145 вучняў. Тут была бібліятэка, кабінеты — мінералагічны і французскай мовы.

7 кастрычніка 1859 г. выйшаў дазвол на адкрыццё ў Мазыры гімназіі. Выконваючым абавязкі дырэктара быў прызначаны надворны саветнік Карл Вронскі. 24 лістапада ў гімназіі пачаліся заняткі. Пераважную большасць выхаванцаў яе складалі дзеці дваран і чыноўнікаў. На ўтрыманне гімназіі ў 1861 г. з дзяржаўнай казны выдзелена 10 372 рублі. У сувязі з тым, што ў наступныя гады колькасць вучняў скарацілася, гімназія ў 1876 г. была пераўтворана ў шасцікласную прагімназію. У 1888/89 навучальным годзе ў ёй налічвалася 134 вучні, 12 настаўнікаў і 6 іх памочнікаў. На ўтрыманне ўстановы выдзелена 19 247 рублёў.

З жаночых навучальных устаноў у Мазыры вядомы чатырохкласны пансіён Асоўскай, адкрыты ў 1855 г. Навучэнкі пансіяната плацілі ў год 150 рублёў за вучобу і жыллё. З тых, хто меў сваё жыллё, бралі 75 рублёў. Выкладаліся закон Божы, руская, нямецкая, польская і французская мовы, гісторыя, геаграфія, арыфметыка, чыстапісанне, музыка, спевы, танцы, рукадзелле. У пансіянаце ў асноўным вучыліся дзяўчаты дваранскага паходжання, толькі некалькі асоб належала да простага гарадскога і духоўнага саслоўя. У 1855 г. у пансіёне, які да 1874 г. знаходзіўся пад наглядам дырэктара Мазырскай гімназіі, налічвалася 8 выкладчыкаў і 11 навучэнак, у 1860 г. настаўнікаў было 11, вучаніц — 27.

У 1863 г. Мазырскі прыватны жаночы пансіён перайменаваны ў вучылішча св. Вольгі. Гэта быў лепшы перыяд у жыцці навучальнай установы, калі яна знаходзілася пад наглядам жонкі мазырскага ваеннага начальніка Вольгі Чакмаровай.

У 1870 г. заснавана двухкласнае прыватнае жаночае вучылішча, утрымальнікам і настаўніцай якога была М. І. Мысоўская. Яно знаходзілася ў прыватным доме, аплата за памяшканне складала 200 рублёў у год.

Пасля адмены прыгоннага права колькасць народных школ значна павялічылася. Былі адкрыты вучылішчы ў мястэчку Скрыгалаў, у вёсках Мялешкавічы і Сідзельнікі (Гурыны). Ёсць звесткі, што ў маёнтку Барбароў школа для дзяцей сялян была адкрыта яшчэ ў 1821 г., існавала яна некалькі гадоў і была адноўлена толькі ў 1863 г.

У Скрыгалаве, дзе было больш чым 100 двароў і жыло звыш 600 чалавек, вучылішчам кіраваў законанастаўнік, свяшчэннік Мікалаеўскай царквы Васіль Іванавіч Завітневіч, у Мялешкавічах настаўніцай была прызначана Соф'я Паўлаўна Тылінская, дачка свяшчэнніка мясцовай царквы.

У 1865 г. народнае вучылішча адкрыта ў вёсцы Міхалкі (56 вучняў), у 1873 г. — у Слабадзе (52 вучні). Захаваліся прозвішчы настаўнікаў некаторых навучальных устаноў канца мінулага стагоддзя: у Міхалках гэта быў П. Ф. Кунцэвіч, у Мялешкавічах — А. Я. Дарашэвіч, у Слабадзе — П. А. Турко, у Скрыгалаве — К. М. Захар'яш. Усе яны атрымалі адукацыю ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі.

У гэтых школах выкладаліся закон Божы, руская мова і пісьмо, чытанне, славянская мова і чытанне, арыфметыка, спевы. У 1864 г. ва ўсіх вучылішчах павета налічвалася 426 вучняў, сярод іх — 28 дзяўчынак.

1 студзеня 1864 г. выйшаў цыркуляр Віленскага генерал-губернатара аб забароне выкладання ў сельскіх вучылішчах Мінскай губерні польскай мовы — рэакцыя царскіх улад на паўстанне 1863 г. У адказ на гэту забарону ў Мазырскім павеце пачалі ўзнікаць тайныя школы, дзе дзяцей навучалі польскай грамаце. Выкладчыкі яе часта прыцягваліся да адміністрацыйнай адказнасці.

У пачатку XX ст. для сялянскіх дзяцей адкрыліся аднакласныя народныя вучылішчы ў Балажэвічах, Бярозаўцы, Бібіках, Васькаўцы, Глініцы, Жахавічах, Кустаўніцы, Прудку, Раманаўцы, Махнавічах, Лешні, Малым Бакаўцы. У 1913 г. з'явілася яшчэ адна навучальная ўстанова — у Казіміраў-

цы, а ў 1916 г. пачалі працаваць вучылішчы ў Антонаўцы і Зімовішчах.

7 кастрычніка 1909 г. прайшлі ўрачыстасці з выпадку 50-годдзя гімназіі. Гэта было вялікае агульнанароднае свята з урачыстым малебнам у саборы св. Міхаіла, феерверкам і гуляннямі каля прагімназіі і ў гарадскім садзе. Прыехала многа былых вучняў, атрымана шмат віншавальных тэлеграм.

Не паспелі сціхнуць гукі аркестраў, як наглядчык Віленскай навучальнай акругі паведаміў, што міністр народнай асветы дазволіў пераўтварыць Мазырскую шасцікласную прагімназію ў гімназію.

29 кастрычніка 1911 г. у Мазыры адкрылася жаночая гімназія, у якой было 7 асноўных і 1 падрыхтоўчы клас. У 1915 г. на яе ўтрыманне з казны адпускалася 1500 руб., зборы за навучанне складалі каля 17 000 руб. у год. Плата за навучанне ў падрыхтоўчым класе была 60 руб., у 1—3 класах — 70 руб., у 4—5 класах — 80, у 6—7 класах — 100 руб. Такім чынам, у жаночай гімназіі адукацыя каштавала амаль у два разы даражэй, чым у мужчынскай.

Для большасці дзяцей з бедных сем'яў нават пачатковая школа была недасягальнай. І. Зялінскі ў кнізе «Матэрыялы для геаграфіі і статыстыкі Расіі» ў пачатку 60-х гадоў XIX ст. пісаў: «...Недостаток помещений, учителей, средств делают начальное образование для лиц бедного сословия почти невозможным».

27 студзеня 1907 г. у Мазыры была адкрыта ніжэйшая рамесная школа, на ўтрыманне якой выдаткоўвалася 4910 рублёў. Плата за навучанне складала 6 рублёў у год, у школе навучалася да 50 чалавек. Выкладаліся закон Божы, руская мова, арыфметыка, чарчэнне, маляванне, тэхналогія апрацоўкі металаў, слясарная справа. У першы год у рабоце школы было выяўлена шмат недахопаў. 23 верасня 1907 г. камісія ў складзе паліцэйскага чыноўніка і земскага доктара склала акт абследавання Мазырскай рамеснай школы:

«Комнаты, предназначенные под мастерские, чрезвычайно тесные, причем в каждой из них, несмотря на сухую погоду, сырость, что вредно отражается на здоровье как учащихся, так и учителей, классная комната по всем размерам не соответствует вмещению 34 человек. В одной из мастерских, где находятся тиски и другие инструменты, ютится сторож со своей кроватью, кузница помещается в подвальном этаже в маленькой комнате с низким потолком, стены которой наполовину мокры от сырости...»

Пачалася першая сусветная вайна. Ужо ў жніўні 1914 г. кіраванне Віленскай навучальнай акругі скараціла грашовыя выдаткі на патрэбы рамеснай школы. Ва ўсходніх раёнах Беларусі апынулася шмат бежанцаў з раёнаў ваенных дзеянняў. Каб вучыць дзяцей, адкрываліся новыя школы. У Мазыры і павеце ў 1916 г. дзейнічала 7 школ для дзяцей польскіх бежанцаў. Мясцовыя дзеці ў іх не дапускаліся. У школах выкладаліся руская мова, гісторыя, геаграфія.

У Мазыры была прыватная навучальная ўстанова — ніжэйшае вучылішча, якое ўтрымлівалася на сродкі апекуноў. Працавала яўрэйская талмуд-тора, у якой вучыліся толькі хлопчыкі. У горадзе было адкрыта таксама 30 хедараў — пачатковых яўрэйскіх школ па абучэнні хлопчыкаў асновам іудаізму. У яўрэйскім вучылішчы з сумесным навучаннем на 1 студзеня 1917 г. займаліся 53 вучні, выкладанне вялі два настаўнікі. Хедар быў і ў мястэчку Скрыгалаў.

*А. Бобр*

## Мазырская гімназія

У 1803 г. павятовая школа ў Мазыры была пераўтворана ў павятовае вучылішча, а з 1834 г. — у дваранскае вучылішча з пяцігадовым тэрмінам навучання. У наступныя гады вучылішча стала трохгадовым, што выклікала вялікае незадавальненне бацькоў. Колькасць навучэнцаў скарацілася ўдвая. Грамадскасць настойвала на адкрыцці ў горадзе гімназіі, для гэтага збіраліся сродкі.



Мужчынская гімназія. 1905

Нарэшце па рашэнні Міністэрства народнай асветы 7 кастрычніка 1859 г. вучылішча было закрыта і заснавана гімназія — першая сярэдняя навучальная ўстанова Мазыра. 18 лістапада прагучаў першы званок... Праз два гады адкрыліся 4—6 класы, потым — сёмы. У 1865 г. гімназія пераўтворана ў класічную з выкладаннем лацінскай і грэчаскай моваў.

Першы выпуск у гімназіі адбыўся ў 1862 г. Яе скончылі 11 юнакоў, з іх адзін з залатым і два з сярэбраным медалямі. У наступныя гады было 5—8 выпускнікоў. За паўтара дзесятка гадоў гімназію скончылі 108 чалавек — дзяцей дваран, чыноўнікаў, святчэннікаў, купцоў. Ім быў адкрыты шлях да вышэйшай адукацыі.

Галоўная ўвага ў вучэбна-выхаваўчай рабоце ўдзялялася рэлігійна-маральнаму выхаванню, «преданности Государю и Отечеству». Выкладчыкі гімназіі павінны былі весці ўрокі толькі на рускай мове. Гэта выклікала пэўныя цяжкасці, большасць выкладчыкаў і гімназістаў былі палякамі. З 1864 г. настаўнікамі прызначаліся толькі рускія.

Да гімназістаў прад'яўляліся суровыя патрабаванні, распаўсюджанай з'явай было другагодніцтва, пераэкзаменоўкі. У 1863 г. з 133 вучняў пераведзены ў наступныя класы толькі 61, у 1873 г. з 132 — 44. Да 1871 г. шырока практыкавалася пакаранне розгамі, навучэнцы часта выключаліся з гімназіі.

Навучанне ў гімназіі было платным, плата бесперапынна ўзрастала: у першыя гады яна складала 5 рублёў за год, у канцы XIX ст. — ужо 40. Педагагічны савет неаднаразова прымаў рашэнне аб вызваленні ад аплаты найбольш бедных навучэнцаў.

Гімназія ў такім правінцыяльным палескім гарадку адыгрывала ролю сапраўднага культурнага цэнтра. Бібліятэка, сабраная настаўнікамі, у 1908 г. налічвала звыш шасці тысяч кніг. Карысталіся ёю не толькі гімназісты. Шырока адзначаліся дні памяці А. С. Пушкіна, М. В. Гогаля, палкаводца А. В. Суворава. Гэтыя мерапрыемствы станавіліся адметнымі падзеямі ў жыцці горада.

Пры гімназіі была адкрыта нядзельная школа для навучання чытанню, пісьму і арыфметыцы ўсіх гараджан.

За школай быў устаноўлены пастаянны паліцэйскі нагляд, і ў чэрвені 1861 г. яна была закрыта ў сувязі з вальнадумствам выкладчыкаў і навучэнцаў, абвінавачаных у распаўсюдж-

ванні «шкодных вучэнняў», «абуральных ідэй». У сувязі з нарастаннем рэвалюцыйных настрояў у грамадстве ў 1861 г. дырэктару гімназіі было загадана ўважліва сачыць, каб гімназісты не ўдзельнічалі ў палітычных дэманстрацыях. За гэта неадкладна выключалі з гімназіі.

Гімназісты не павінны былі выходзіць з дому пасля 19 гадзін, а да 19 — выходзілі з пісьмовага дазволу. Навучэнцы ў адказ на гэта парвалі спецыяльныя журналы выхаду ў горад. Чатыры чалавекі былі выключаны. Калі ў 1863 г. высветлілася, што група вучняў рыхтуе зброю, мае ружжы і нажы, пачаліся новыя выключэнні. Гімназісты патрабавалі вярнуць таварышаў. У адказ — новыя выключэнні. Выключаныя хадзілі па горадзе ў «мяцежнай вопратцы», спрабавалі набыць зброю. У сакавіку 1863 г. у Мазыры і павеце было аб'яўлена ваеннае становішча.

Не ўсе настаўнікі былі аднадушнымі ў рэпрэсіях да гімназістаў. «За ўхіленне ад абмеркавання спраў аб удзеле вучняў у палітычных беспарадках» быў зняты з пасады інспектар гімназіі М. А. Мудроў, які працаваў з дня яе заснавання. У 1873 г. «по высочайшему повелению» Мазырская гімназія была пераўтворана ў трох-, а потым — у шасцікласную прагімназію, якая не давала сярэдняй адукацыі. Гэта выклікала незадавальненне насельніцтва, адток вучняў.

У кастрычніку 1909 г. грамадскасць горада адзначыла 50-годдзе гімназіі. Быў атрыманы дазвол на пераўтварэнне прагімназіі ў васьмікласную гімназію, утрыманне сёмых і восьмых класаў рабілася за кошт платы за навучанне і дапамогі ад гарадскіх улад. Набліжаліся бурныя падзеі 1917 г. ...

За гады свайго існавання з гімназіі і прагімназіі выйшла больш як тысяча чалавек. Многія выпускнікі сталі педагогамі, урачамі, інжынерамі, іншымі спецыялістамі.

*А. Бобр, Я. Фарбераў*

## Бацька і сын Дабравольскія

Сярод выкладчыкаў Мазырскай гімназіі было нямала сапраўдных патрыётаў свайго краю. Так, у 70-я гады, пасля заканчэння Маскоўскага універсітэта, выкладчыкам матэматыкі ў Мазыр прыехаў Уладзімір Ягоравіч Дабравольскі. Настаўнік карыстаўся вялікім аўтарытэтам не толькі сярод вучняў, але і ўсіх жыхароў Мазыра. Ён падрыхтаваў і выдаў у Маскве ў 1886 і 1888 гг. навучальныя дапаможнікі «Падрыхтоўчы курс геаметрыі» і «Памятная кніжка для вучня», якія атрымалі высокую ацэнку ў сучаснікаў.

У 1889 г. У. Я. Дабравольскі памёр. Уладзіміру Дабравольскаму-сыну было 10 гадоў, калі ён застаўся сіратой. Вучыўся ў Мазырскай прагімназіі, затым — у сярэдняй школе. У 1906 г. з адзнакай закончыў Маскоўскае вышэйшае тэхнічнае вучылішча і атрымаў званне інжынера-механіка. За ўдзел у антыўрадавых дэманстрацыях у час вучобы два гады адбываў ссылку ў Сібіры.

У. У. Дабравольскі займаўся выкладчыцкай дзейнасцю, а таксама далейшым вывучэннем механікі і іншых навук, праяўляў асаблівую цікавасць да новай тэхнікі, чытаў публічныя лекцыі па паветраплаванні і авіяцыі. У 1913 г. перайшоў на работу ў Маскоўскае тэхнічнае вучылішча, дзе выкладаў механіку.

У. У. Дабравольскі — доктар тэхнічных навук, прафесар. З 1922 г. ён выкладчык інстытутаў — інжынераў транспарту і электратэхнічнага ў Маскве. Кіраваў кафедрамі ў Ваенна-паветранай акадэміі імя М. Я. Жукоўскага, станкабудаўнічага інстытута і Інстытута машыназнаўства Акадэміі навук СССР. Перад вайной неаднаразова наведваў Мазыр. Быў членам-карэспандэнтам АН СССР, меў шэраг урадавых узнагарод.

Памёр У. У. Дабравольскі 18 жніўня 1956 года.

*М. Капач, М. Каян*

## «Брушны тыф, дызентэрыя, каўтун...»

Адсутнасць элементарнага медыцынскага нагляду за насельніцтвам, нястача сродкаў і спецыялістаў — усё гэта спрыяла распаўсюджванню сярод насельніцтва халеры, воспы, ліхаманкі, туберкулёзу, брушнога тыфу, дызентэрыі, каўтуна. На думку І. Зялінскага, асноўнымі прычынамі высокай смяротнасці сярод жыхароў Палесся з'яўлялася «низменность положения и огромные пространства болот...». У гэтым сцвярджэнні ёсць доля ісціны, але, бадай, галоўнай прычынай такога становішча з'яўлялася слабая матэрыяльная база аховы здароўя.

У 30-я гады XIX ст. у Мазыры існавала бальніца, якая размяшчалася ў будынках былога бернардзінскага манастыра. Яшчэ ў 1838 г. Мінская губернская будаўнічая камісія вынесла рашэнне пабудаваць у Мазыры акружную лячэбніцу на 30 ложкаў. Але не хапіла сродкаў, і праект не ажыццявіўся. На ўвесь павет была адна аптэка.

У 1836 г. упершыню 2567 дзецям Мазырскага павета была зроблена прышчэпка на воспу. Яе рабілі ў горадзе фельчар гарадской бальніцы, лекарскі памочнік і цырульнік. Усяго ў павеце гэтай няпростай справай было занята 5 фельчараў, лекарскі вучань, 20 цырульнікаў і 4 казённыя воспапрывівальнікі.

На 1 снежня 1853 г. у бальніцы на лячэнні знаходзіліся 54 хворыя. У наступным годзе да доктара звярнулася 1985 чалавек, палепшылі здароўе 1832. На ўтрыманне гарадской бальніцы ў год адпускалася 2468 рублёў (на два жаночыя манастыры, не ўлічваючы царквы і сабора, трацілася ў той час 3695 рублёў).

У турме быў асобны пакой для хворых арыштантаў. У некаторых маёнтках памешчыкі абсталёўвалі спецыяльныя памяшканні, дзе хворыя сяляне маглі атрымаць медыцынскую дапамогу, але часцей людзі не зважалі на хваробу, лячыліся дома ўласнымі сродкамі. Аптэкай у Мазыры валодаў правізар Янушкевіч. У год выдавалася каля 1200 рэцэптаў.

У сярэдзіне XIX ст. у Мазырскім павеце са 100 дзяцей толькі 52 дажывала да ўзросту 15 год, сярэдняя працягласць жыцця складала 24,2 гады.

Пад канец XIX ст. у Мазыры працавалі дзве бальніцы — гарадская на 15 ложкаў і турэмная, якія абслугоўваў адзін доктар. Гарадская бальніца размяшчалася ў аднапавярховым драўляным наёмным доме і ўтрымлівалася за кошт платы за лячэнне і невялікай дапамогі казны. У турэмнай бальніцы было чатыры месцы.

У 1904 г. колькасць ложкаў у бальніцы павялічылася да 24. Па-ранейшаму не хапала медыцынскага персаналу, адзін доктар прыходзіўся на 1876 жыхароў горада. Хворыя мелі магчымасць лячыцца ў вольнапрактыкуючых урачоў і фельчараў. Да іх звярталіся бяднейшыя жыхары горада, насельнікі рабочых ускраін і бліжэйшых вёсак. Медыцынскія работнікі з'яўляліся спецыялістамі ва ўсіх галінах медыцыны. За прыём хворы плаціў 50 кап. — амаль увесь дзённы заробак рабочага.

У 1908 г. над Мазыром навісла пагроза эпідэміі халеры. У горадзе супраць хваробы былі прыняты некаторыя меры. На фанернай фабрыцы «Прыма» былі вывешаны аб'явы: «Врачебной помощью пользуются все без исключения рабочие фабрики, семействам же рабочих, т. е. их женам и детям, предоставляется помощь в исключительном случае серьезных заболеваний, как-то: тифа и других опасных болезней». Мінскі губернатар сведчыў: «В бытность мою 15 сентября в Мозыре мною установлено, что на фабрике «Прима» с довольно значительным количеством рабочих не имеется никакого санитарного надзора, что представляет особую опасность в настоящее время, когда в Мозыре появилась холера».

Больш за 10 гадоў перад першай сусветнай вайной, пачынаючы з 1903 г., урачом Мазырскай павятовай бальніцы

працаваў Гаўрыла Яфімавіч Сает, высланы за рэвалюцыйную дзейнасць з Вільні на Палессе. Гэта быў урач шырокага профілю, які меў глыбокія медыцынскія веды і вялікі ўрачэбны вопыт, валодаў англійскай, французскай і нямецкай мовамі, быў знаёмы з рускай і замежнай медыцынскай літаратурай.

Мазырскі павет у пачатку стагоддзя быў разбіты на восем урачэбных участкаў, у тым ліку Скрыгалаўскі і Мазырскі. У 1910—1914 гг. доктарам у Скрыгалаве працаваў Васіль Цімафеевіч Сімановіч. Ён успамінаў: «...Цяжка цяпер уявіць умовы працы ўрача ў Скрыгалаве. Я адзін, а навокал сяляне, сярод якіх многа хворых, вялікая смяротнасць, адсутнасць неабходных медыкаментаў. А яшчэ пачуццё адзіноцтва і бездапаможнасці, паколькі бліжэйшы сябра па прафесіі — урач знаходзіўся за 40—50 вёрст, недзе ў Мазыры і ў Петрыкаве...»

*А. Бобр*

### Вуліца доктара Саета

Старажытны Мазыр раскінуўся на правым высокім беразе Прыпяці. Недалёка ад ракі праходзіць зялёная вуліца імя доктара Г. Я. Саета.

Ён нарадзіўся і жыў у Вільні. У 1898 г. скончыў медыцынскі факультэт Дзерпцкага універсітэта (цяпер Тартускі універсітэт) і займаўся ўрачэбнай дзейнасцю ў Вільні. Удзельнічаў у сходах рэвалюцыйных гурткоў, за што быў высланы царскай паліцыяй у мястэчка Юравічы Рэчыцкага павета. Бліскучая адукацыя, атрыманая ва універсітэце, выдатныя здольнасці прадказвалі яму паспяховую дзейнасць. Але ён вымушаны быў пакінуць Вільню. У 1903 г. з сям'ёй пераехаў у Мазыр і ўладкаваўся на працу ў павятовую бальніцу.

У пачатку руска-японскай вайны Г. Я. Сает быў прызваны на вайсковую службу і накіраваны ў Маньчжурыю ў дзеючую армію малодшым палкавым

Г. Я. Сает



урачом. Больш за паўтара года ён правёў на фронце. Там сустрэўся і пазнаёміўся з ваенным урачом В. В. Верасаевым, таксама выпускніком медыцынскага факультэта Дзерпцкага універсітэта. Абодва ўдзельнічалі ў Мукдэнскай бітве (люты 1905 г.). Успаміналі родны універсітэт, які праславіўся дзейнасцю К. Бэра, М. І. Пірагова, М. А. Дзяканава і другіх прафесараў, студэнцкія карпарацыі... Разам цяжка перажывалі разлад і непадрыхтаванасць рускай арміі да вайны, нераспарадчасць страявых генералаў, якія кіравалі медыцынскай службай. Сяброўскія ўзаемаадносіны і перапіска Г. Я. Саета з В. В. Верасаевым, будучым вядомым пісьменнікам, працягвалася і пасля вайны.

Вярнуўшыся ў 1905 г. з Далёкага Усходу, Г. Я. Сает аддаваў усе сілы і веды ў барацьбе з распаўсюджанымі ў той час сярод насельніцтва Мазыршчыны інфекцыйнымі хваробамі (тыф, воспа, дыфтэрыя, ліхаманка, сухоты і інш.). Зімою 1907—1908 гг. выязджаў на курсы ўдасканалення па афтальмалогіі ў ардынатуру Кёнігсбергскага універсітэта.

Мазырская павятовая бальніца на 30 ложкаў (адкрыта ў 1863 г.) размяшчалася ў двух старых драўляных дамках. У мужчынскім і жаночым аддзяленнях лячылася 44 хворыя. Абслугоўвалі іх два ўрачы і два фельчары. Аперацыі праводзіліся ў прахадным пакоі. Павятовая бальніца на 10 ложкаў з адным урачом была ў той час

у Скрыгалаве, фельчарскія пункты — у Слабадзе Скрыгалаўскай, Мялешкавічах.

Г. Я. Сает меў глыбокія медыцынскія веды і вялікі ўрачэбны вопыт. Ён з'яўляўся не толькі тэрапеўтам высокай кваліфікацыі, але і спецыялістам у галіне афтальмалогіі, аталарынгалогіі, гінекалогіі, хірургіі. Прымаў і лячыў хворых у стацыянары бальніцы, але меў і хатні ўрачэбны пакой. Надзейным памочнікам доктара была яго жонка М. С. Сает. Пасля заканчэння Варшаўскай кансерваторыі яна не стала прафесійным музыкантам, а, скончыўшы яшчэ зубаўрачэбную школу, дапамагала мужу. У грамадзянскую вайну і пасля яе працавала медыцынскай сястрой у савецкіх шпіталях.

Г. Я. Сает займаўся навуковымі даследаваннямі. У 1911 г. ім была апублікавана навуковая праца аб санітарным стане Мазыра.

У першую сусветную вайну Г. Я. Сает зноў прызываўся на вайсковую службу і знаходзіўся ў дзеючай арміі. За ўдзел у руска-японскай і першай сусветнай войнах узнагароджаны пяццю баявымі ордэнамі і Георгіеўскім крыжам.

Г. Я. Сает з натхненнем сустрэў Лютаўскую і Кастрычніцкую рэвалюцыі. Звольніўшыся з арміі, у 1917 г. вярнуўся ў Мазыр. Тут з першых дзён устанаўлення Савецкай улады яму даручылі займацца арганізацыяй аховы здароўя на Палессі.

Нават грамадзянская вайна не спыніла яго актыўную грамадскую і ўрачэбную дзейнасць. З 1918 г. Г. Я. Сает знаходзіўся ў радах Чырвонай Арміі. За ўмелае аказанне ўрачэбнай дапамогі параненым чырвонаармейцам узнагароджаны ганаровай шашкай.

У кастрычніку 1919 г. Г. Я. Сает быў адазваны з вайсковай службы ў Мазыр для барацьбы з эпідэміяй сыпнога тыфу. Гэта быў другі, не менш небяспечны, фронт. У барацьбу з тыфам уключыліся многія ўрачы, фельчары, сёстры міласэрнасці. Яны не шкадавалі сябе і аддавалі ўсе сілы, каб ліквідаваць эпідэмію. 26 снежня 1919 г. Гаўрыла Яфімавіч Сает памёр ад сыпнога тыфу...

*«Здравоохранение Белоруссии». 1991. № 1. С. 78—80.*

# З гісторыі вёсак

Цяпер у раёне 93 сельскія населеныя пункты. У кожнага свая гісторыя. Некаторым — многа вякоў, іншым — некалькі дзесяткаў гадоў. Адны неаднаразова на працягу тысячагоддзя знікалі і адраджаліся, другія засталіся толькі ў памяці пакаленняў ды ў дакументах.

Адна з найбольш старажытных вёсак раёна, якая ўпамінаецца ў дакументах,— Міхалкі. У «Геаграфічным слоўніку Каралеўства Польскага», выдадзеным у 1880 г. у Варшаве, пра яе гаворыцца пад 1432 г. Вёска Прудок — з 1515 г. Да гэтага часу адносіцца ўпамінанне аб вёсцы Скрыгалаў, якая на працягу стагоддзяў праз гісторыю праходзіць як мястэчка. Мялешкавічы — з 1568 г. Вёскі Зімовішчы, Тварычаўка, Бокаў (Бокаўшчына), Барыскавічы (Брысаўшчына) упамінаюцца ў перапісе апалчэння Вялікага княства Літоўскага 10 мая 1567 г.

Ішлі стагоддзі, мяняліся дзяржавы, мяняўся адміністрацыйны падзел тэрыторыі, расла колькасць насельніцтва, і ў дакументах упамінаюцца ўжо вёскі Слабада Скрыгалаўская — 1649 г., Козенкі (хутар) — 1776 г., Хамічкі — 1796 г., Балажэвічы — 1826 г., Загорыны — 1847 г.

На геаграфічнай карце Мінскага ваяводства значыцца, што ў канцы XVII — пачатку XVIII стст. у сучасных межах раёна было каля трыццаці вясковых пасяленняў: Асавец, Бабіч (Барбароў), Балажэвічы, Барыскавічы, Бярозаўка, Глініца, Васількова (Васькаўка), Ізгорскі (цяпер не існуе), За-